# Надзейны компас у моры ведаў

Паўстагоддзя Нацыянальная бібліятэка Беларусі складае своеасаблівы бібліяграфічны летапіс жыцця краіны – штомесячны бюлетэнь **«Новыя кнігі: па старонках беларускага друку»**. За гады свайго існавання паказальнік стаў адным з самых папулярных і даступных бібліяграфічных выданняў Беларусі, набыў аўтарытэт за яе межамі. Бюлетэнь з'яўляецца добрым дарадчыкам і незаменным памочнікам для выкладчыкаў і настаўнікаў, спецыялістаў у розных галінах, навучэнцаў, абітурыентаў і студэнтаў. Дапаможнік карыстаецца вялікім попытам не толькі сярод індывідуальных спажыўцоў, але і сярод ведамстваў і арганізацый рэспублікі. Па выданні можна вывучаць гісторыю краіны: усе яго нумары за 50 гадоў (а іх каля 600) складаюць сапраўдную бібліяграфічную анталогію. Структура і методыка складання матэрыялаў дазваляюць спалучаць у паказальніку як бягучую, так і рэтраспектыўную ўніверсальную, праблемна-тэматычную і персанальную інфармацыю. «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» (далей «Новыя кнігі...») – надзейны компас у бягучым нацыянальным дакументным патоку.




Аб найбольш значных навінках айчынных выдавецтваў інфармуе раздзел **«Навінкі беларускага друку»**, які ўключае звесткі аб кнігах з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і артыкулах з рэспубліканскіх часопісаў, газет «Літаратура і Мастацтва» і «Культура». Інфармацыя прадстаўлена ў шасці падраздзелах. У падраздзеле *«Што чытаць пра Беларусь»* адлюстроўваюцца матэрыялы, прысвечаныя гісторыі, культуры, прыродзе Беларусі, роднай мове, спорту, а таксама знакамітым ураджэнцам і дзеячам краіны. Спецыялістам у розных галінах прызначаны падраздзел *«У дапамогу прафесійнаму чытанню»*. Добрым навігатарам па навучальнай і даведачнай літаратуры з'яўляецца рубрыка *«У дапамогу абітурыенту»*. Падраздзел *«Папулярная літаратура і літаратура для самаадукацыі»* прапануе дакументы па ўсіх галінах ведаў. Падраздзел

*«Мастацкая літаратура»* ўключае звесткі пра кнігі і часопісныя публікацыі раманаў, аповесцей, п'ес, паэм. Аб лепшых выданнях дзіцячай мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры інфармуе рубрыка *«Кнігі і публікацыі — дзецям»*. Для зручнасці выкарыстання матэрыялы ў падраздзелах сістэматызаваны па галінах ведаў. У выпадку неінфарматыўнасці назвы бібліяграфічныя звесткі аб крыніцах дапоўнены кароткімі анатацыямі, у якіх раскрываюцца геаграфічныя назвы, прозвішчы, даты, удакладняецца тэма публікацыі, што дазваляе спажыўцу арыентавацца ў мностве прапанаваных матэрыялаў.

Раздзел **«У полі зроку рэцэнзента»** паведамляе пра рэцэнзіі, змешчаныя ў рэспубліканскіх часопісах і газетах, на выданні, уключаныя ў «Навінкі беларускага друку».

Цікавым і пазнавальным чытаннем з'яўляюцца дадаткі да бюлетэня, якія могуць быць выкарыстаны і як самастойныя дапаможнікі. Большасць дадаткаў дапамагаюць зазірнуць у мінулае Беларусі, асэнсаваць нашу гісторыю і сучаснасць, здабыткі культуры, асвятляюць актуальныя пытанні. Асобныя нумары бюлетэня змяшчаюць **«Беларускі каляндар, ... год»**, што ўяўляе сабой пералік найбольш значных юбілейных і памятных дат, якія будуць адзначацца ў наступным годзе. Спіс фарміруецца на аснове ўніверсальнай беларусазнаўчай базы даных Нацыянальнай бібліятэкі «Беларусь у асобах і падзеях». Больш поўная версія календара змяшчаецца ў штогоднім электронным інфармацыйным рэсурсе «Беларускі каляндар, ... год». Фактаграфічная інфармацыя ў выданні дапаўняецца ілюстрацыйным матэрыялам (фотаздымкамі асоб, лагатыпамі арганізацый і інш.) і спасылкамі на аўтарытэтныя афіцыйныя web-сайты.

У якасці дадаткаў у «Новых кнігах...» сістэматычна друкуюцца **«Даты беларускага календара»** на бягучы і наступны гады, у якіх змяшчаюцца матэрыялы, прысвечаныя грамадска значным падзеям у сацыяльна-культурным жыцці краіны. Памятныя даты складаюцца са спіса літаратуры і разгорнутых даведак. У біяграфічных артыкулах адлюстроўваюцца жыццё і творчасць выдатных асоб, у гістарычных — гісторыя і сучасны стан тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак, асноўныя напрамкі дзейнасці буйнейшых устаноў рэспублікі і г. д. За год у бюлетэні публікуецца больш за сорак такіх даведак.

Частка дадаткаў да выдання — вялікія па аб'ёме (1–1,5 друкаванага аркуша) анатаваныя бібліяграфічныя спісы і агляды літаратуры па актуальных тэмах, якія маюць вызначаную структуру, дапаўняюцца ўступным словам, невялікімі нарысамі да асноўных раздзелаў, рэдка — ілюстрацыямі. У мэтах папулярызацыі нацыянальнай культурнай і гістарычнай спадчыны ў дадатках да бюлетэня змяшчаюцца матэрыялы беларусазнаўчага характару. Так, у паказальніку быў апублікаваны бібліяграфічны спіс ***«Каб жыла культура продкаў: народныя святы, абрады, традыцыі»*** (2003, № 6, 7). У дадатку адлюстраваны матэрыялы ў дапамогу педагогам-арганізатарам і культработнікам: зборнікі песень, узоры сцэнарыяў, традыцыйны рэпертуар свят, тэматычны падбор тэкстаў. Змешчаны спіс літаратуры, прысвечанай падрыхтоўцы святочнай атрыбутыкі, арганізацыі святочных карагодаў, гульняў, забаў і ігрышчаў. Бібліяграфічная экскурсія па мастацтве Беларусі прадстаўлена ў спісе ***«Беларускае мастацтва на старонках выданняў XXI ст.»*** (2007, № 11). Дапаможнік прапануе кнігі, якія прысвечаны беларускаму кіно, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву, помнікам архітэктуры розных стагоддзяў, беларускім акцёрам, рэжысёрам, спевакам, музыкантам і мастакам. Уключаны дакументы, якія знаёмяць з фондамі і дзейнасцю музеяў краіны, у тым ліку Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Музея сучаснага мастацтва. У спісе добра прадстаўлены архітэктура, музыка, тэатр, кіно, жывапіс, скульптура, графіка і г. д. Разам са складальнікамі спіса ***«Па гістарычных мясцінах Беларусі»*** (2004, № 8) можна наведаць цудоўныя куткі беларускай даў-

ніны: старажытныя гарады, сярэдневяковыя замкі, палацы і храмы. Каштоўным краязнаўчым інфармацыйным рэсурсам з'яўляецца бібліяграфічны спіс ***«Да 940-годдзя з часу першага летапіснага ўпамінання Мінска»*** (2007, № 7), які асвятляе невядомыя старонкі жыцця сталіцы. У дапаможніку прадстаўлена захапляючае бібліяграфічнае падарожжа па выдатных мясцінах горада, якое дазваляе адчуць подых мінулых стагоддзяў і рытм сённяшняга часу. У спісе змешчана літаратура аб вядучых прадпрыемствах, выдавецтвах, навуковых і навучальных установах, культурна-відовішчных цэнтрах сталіцы. Уключаны выданні, прысвечаныя транспарту і сувязі Мінска, а таксама сродкам масавай інфармацыі. З гісторыяй і сучасным жыццём некаторых нацыянальных супольнасцей Беларусі (рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў і інш.) знаёміць бібліяграфічны спіс ***«Нацыянальныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць»*** (2004, № 6). Да 400-годдзя памяці князя К.К.Астрожскага ў 2008 годзе на старонках бюлетэня быў змешчаны матэрыял, прысвечаны яго жыццю і дзейнасці. Традыцыйную біяграфічную даведку і спіс літаратуры складальнікі дапоўнілі спасылкай на афіцыйны web-сайт Беларускай Праваслаўнай Царквы, на якім прадстаўлены больш падрабязныя звесткі аб славутым асветніку. Дарэчы, гэты інавацыйны падыход выкарыстоўваецца ў многіх бібліяграфічных спісах, якія выходзяць у якасці дадаткаў да бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку». У гэтым годзе Беларусь адзначыла 65-ую гадавіну Вялікай Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Добрым навігатарам па літаратуры, у якой асвятляецца неўміручы подзвіг савецкага і беларускага народаў, з'яўляюцца анатаваныя спісы ***«Свяшчэннай памяццю авеяныя гады: да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне»*** (2010, № 3) і ***«Праз полымя вайны: да 65-годдзя вызвалення Беларусі»*** (2009, № 4). Тэме Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны электронныя інфармацыйныя выданні Нацыянальнай бібліятэкі «Паклонімся вялікім тым гадам: 65-годдзю Перамогі прысвячаецца», «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941–1945)», «Подпольная и партизанская печать Беларуси: газеты, листовки, рукописные материалы, стенгазеты», «Шлях да перамогі: песні ваенных гадоў: да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў».

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» былі апублікаваны бібліяграфічныя спісы ***«Да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа»*** (2007, № 4) і ***«Ён любіў Беларусь: (да 70-годдзя з дня нараджэння У.Караткевіча)»*** (2000, № 4). Вялікія па аб'ёме і цікавыя па змесце біяграфічныя артыкулы дапоўнены спісамі твораў пісьменнікаў і публікацый, прысвечаных іх жыццю і творчасці. Гэтыя біябібліяграфічныя дапаможнікі з'яўляюцца добрай падтрымкай для выкладчыкаў літаратуры, студэнтаў філалагічных факультэтаў, абітурыентаў і навучэнцаў. Складальнікі бюлетэня пільна сочаць за літаратурным працэсам у краіне. У выданні друкуюцца агляды навінак беларускай літаратуры. Так, працы пачынаючых і вядомых пісьменнікаў Беларусі знайшлі сваё адлюстраванне ў бібліяграфічным спісе ***«Новыя творы беларускай мастацкай літаратуры»*** (2008, № 9). У дадатку прадстаўлены фантастычныя раманы і аповесці, дэтэктывы, а таксама творы, што асвятляюць маральна-этычныя праблемы сённяшняга дня. Знайшлі сваё месца ў спісе і творы гістарычнага жанру, у якіх паказана далёкае мінулае Радзімы, а таксама жыццё беларусаў у XX стагоддзі.

У «Новых кнігах...» пад рубрыкай **«Пісьменнікі-лаўрэаты»** перыядычна змяшчаюцца звесткі аб беларускіх пісьменніках, якім было прысвоена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Так, у апошнім нумары бюлетэня за 2009 год прадстаўлены невялікі нарыс, прысвечаны творчасці М.З.Башлакова, які за заслугі ў галіне літаратуры быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй імя Янкі Купалы. Літаратуразнаўцам, выкладчыкам і настаўнікам, студэнтам і на-

вучэнцам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй айчыннага кнігадрукавання, культуры і літаратуры, прызначаны бібліяграфічны спіс «Слава і гонар Беларусі: да 520-годдзя з дня нараджэння мысліцеля-асветніка, гуманіста і першадрукара Ф. Скарыны» (2010, № 7).

З нацыянальнымі паркамі, запаведнікамі, помнікамі прыроды рэспублікі, а таксама з Цэнтральным батанічным садам Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі знаёмяць дадаткі пад назвай ***«Запаведныя тэрыторыі Беларусі»***, змешчаныя ў трэцім і чацвёртым нумарах бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» за 2001 год. Аднаму з самых вялікіх лясных масіваў Еўропы прысвечаны анатаваны бібліяграфічны спіс ***«Цуд некранутай прыроды: да 600-годдзя ўстанаўлення ў Белавежскай Пушчы запаведнага рэжыму»*** (2009, № 9). У дапаможніку знайшлі адлюстраванне дакументы, у якіх распавядаецца аб ахове запаведных тэрыторый, Нацыянальным парку «Белавежская Пушча», раслінным і жывёльным свеце запаведніка, яго навуковай і гаспадарчай дзейнасці. У спісе змешчаны звесткі аб творах мастацтва і літаратуры, прысвечаных Пушчы, уключаны альбомы беларускіх фотамастакоў, у якіх адлюстраваны маляўнічыя пейзажы запаведніка, расліны і жывёлы, якія яго насяляюць. Белавежская Пушча паказана і ў якасці турыстычнага аб'екта. Аматарам роднай прыроды прызначана мультымедыйнае выданне Нацыянальнай бібліятэкі «Запаветны напеў, запаветная даль... Белавежская Пушча». Буйнейшым водным артэрыям краіны прысвечаны бібліяграфічны спіс ***«Блакітныя стужкі Беларусі»*** (2003, № 3), які знаёміць чытача з цікавай гісторыяй, асаблівасцямі гідралогіі і рэльефу, разнастайнасцю флоры і фаўны, вялікім гаспадарчым значэннем рэк краіны. Аб шматлікіх турыстычных аб'ектах, маршрутах і відах турызму ў рэспубліцы можна даведацца з бібліяграфічных спісаў ***«Туризм в Беларуси»*** (2006, № 6) і ***«Беларусь туристическая»*** (2009, № 11).

Самай страшнай і маштабнай тэхнагеннай катастрофе мінулага стагоддзя, у выніку якой радыеактыўнае забруджванне закранула ўсе рэгіёны Беларусі, прысвечаны анатаваны бібліяграфічны спіс ***«Да 20-годдзя чарнобыльскай катастрофы»*** (2006, № 3). У паказальніку адлюстраваны ўспаміны ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі ядзернага рэактара і расказы пра падзеі той вясновай ночы, паказаны маштаб катастрофы і шляхі мінімізацыі яе наступстваў, расказваецца пра забруджаныя тэрыторыі. Больш поўная версія спіса прадстаўлена ў электронным выданні Нацыянальнай бібліятэкі «Чарнобыль».

У дадатках да бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» змяшчаюцца матэрыялы па актуальных і грамадска значных пытаннях. У адзінаццатым нумары за 2009 год надрукаваны бібліяграфічны спіс ***«Противодействие торговле людьми в Республике Беларусь»***. Рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння сяла на 2005–2010 гады прысвечаны спіс ***«Современное белорусское село»*** (2006, № 11), у якім знайшлі адлюстраванне дзяржаўныя праграмы развіцця сяла ўсіх рэгіёнаў краіны. З інавацыйнай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь знаёміць бібліяграфічны спіс ***«Инновационная политика государства и пути её реализации»*** (2005, № 6). У дзявятым і адзінаццатым нумарах бюлетэня за 2005 год змешчаны матэрыялы пад назвай ***«ООН и Беларусь: вчера, сегодня, завтра»***, у якіх паказаны роля ААН у сістэме міжнародных зносін, гісторыя супрацоўніцтва Беларусі і ААН і г. д.

У сувязі з павышэннем увагі ўлады і грамадскасці да стану здароўя нацыі бібліёграфы Нацыянальнай бібліятэкі падрыхтавалі спіс ***«Здоровый образ жизни»*** (2008, № 11). У дапаможніку прадстаўлена літаратура, у якой адлюстраваны развіццё айчыннай аховы здароўя, барацьба з тытунекурэннем, алкагалізмам, наркаманіяй і СНІДам у Беларусі, расказваецца пра спорт і фізічную культуру, што адыгрываюць значную ролю ў падтрымцы здароўя. У спісе фарміраванне здаровага ладу жыцця паказана і як

педагагічная праблема. Спорту як асноўнаму кампаненту аховы здароўя нацыі прысвечаны анатаваны бібліяграфічны спіс ***«Беларусь спортивная»*** (2006, № 10), які асвятляе развіццё спорту ў краіне, віды спорту, што набылі папулярнасць сярод нашых суайчыннікаў. Складальнікі бюлетэня не абмінулі ўвагай і дасягненні беларусаў на сусветнай спартыўнай арэне.

У падрыхтоўцы матэрыялаў да памятных дат і тэматычных бібліяграфічных спісаў прымаюць удзел рэспубліканскія і абласныя бібліятэкі краіны. Так, да дадатку пад назвай ***«Бібліятэкі — юбіляры 2010 года»*** (2010, № 6) буйнейшыя бібліятэкі Беларусі падрыхтавалі спісы літаратуры і цікавыя артыкулы, прысвечаныя іх гісторыі, сучаснаму стану і асноўным напрамкам дзейнасці. Сярод актыўных аўтараў дадаткаў да «Новых кніг...» трэба адзначыць Навукова-педагагічную бібліятэку, якая апублікавала на старонках выдання шэраг бібліяграфічных спісаў, прызначаных для выкладчыкаў, настаўнікаў, дзіцячых псіхолагаў і ўсіх тых, хто займаецца адукацыяй і выхаваннем маладога пакалення. У дадатку ***«Псіхалагічныя веды — педагогу»*** (2000, № 7) бібліятэка прапануе літаратуру, прысвечаную фарміраванню рознабакова развітай, сацыяльна актыўнай і творчай асобы, развіццю талентаў дзяцей, псіхалогіі ўзаемаадносін педагога і вучняў, псіхалагічнай службе ў школе. У спісе ***«Одарённые дети: их особенности и организация работы с ними»*** (2008, № 4) раскрыты інтэлектуальныя і псіхалагічныя асаблівасці таленавітых дзяцей, паказаны асаблівасці выяўлення, навучання і развіцця адораных вучняў ва ўмовах дашкольных устаноў, агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў і г. д. У мэтах аказання дапамогі настаўнікам-прадметнікам у іх непасрэднай педагагічнай дзейнасці, паглыблення і пашырэння ведаў Навукова-педагагічная бібліятэка падрыхтавала анатаваны спіс ***«Метадычная літаратура — настаўніку-прадметніку»*** (2009, № 3), у якім змешчана інфармацыя аб метадычных выданнях для пачатковай, базавай і сярэдняй школы. Спіс складаецца з частак: «Прадметы гуманітарнага цыкла» і «Прадметы прыродазнаўча-матэматычнага цыкла». Дадатак прызначаны для павышэння кваліфікацыі педагогаў, знаёміць з перадавым вопытам і новымі педагагічнымі тэхналогіямі. Бібліяграфічны спіс ***«Профільнае навучанне ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі»*** (2006, № 4) знаёміць з кнігамі беларускіх і расійскіх выдавецтваў, у якіх асвятляюцца мэты і змест прафілізацыі адукацыйнага працэсу, праблемы і перспектывы профільнага навучання. Змешчаны дакументы, прысвечаныя мультыпрофільнаму навучанню, прафілізацыі сельскай школы, сучаснай школе за мяжой, паглыбленаму вывучэнню розных вучэбных прадметаў. Таксама Навукова-педагагічная бібліятэка склала наступныя матэрыялы: ***«Інавацыйная дзейнасць ва ўстановах адукацыі»*** (2007, № 3), ***«Маніторынг якасці адукацыі ў рэфармаванні школы»*** (2004, № 9), ***«Педагагічныя тэхналогіі ў адукацыі»*** (2002, № 9), ***«Нацыянальная школа Беларусі»*** (2001, № 9) і інш. На бягучы год на старонках бюлетэня «Новыя кнігі...» запланавана публікацыя бібліяграфічнага спіса бібліятэкі пад назвай ***«Экалагічная адукацыя і выхаванне вучняў у агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь»***.

Да тэмы адукацыі і выхавання звярнуліся і супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі. Так, звесткі аб навукова-папулярнай, універсальнай даведачнай літаратуры для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту прадстаўлены ў анатаваным бібліяграфічным спісе ***«За страницами школьного учебника: белорусские издательства — детям»*** (2003, № 11). Структура дадатку адпавядае пераліку асноўных прадметаў школьнай праграмы. Выпускнікам беларускіх школ прызначаны спіс ***«В помощь абитуриенту»*** (2003, № 4). У спісе ***«Будущее страны строить молодым. Дети и молодёжь Беларуси»*** (2008, № 3) асвятляюцца маладзёжная палітыка рэспублікі, прэзідэнцкія і дзяржаўныя праграмы, прысвечаныя заахвочванню і падтрымцы маладых талентаў. Анатаваны бібліяграфіч-

ны спіс пад назвай ***«Учитесь познавать прекрасное: в помощь эстетическому самообразованию»*** (2001, № 7; 2002, № 5) прапануе матэрыялы, прысвечаныя выяўленчаму мастацтву, музыцы і тэатру. З гісторыяй і асноўнымі напрамкамі дзейнасці айчынных ВНУ знаёміць дадатак ***«Вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі – юбіляры»*** (2000, № 3).

«Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» – каштоўная крыніца інфармацыі. Матэрыялы, што друкуюцца ў дадатках да бюлетэня («Беларускі каляндар, ... год», «Даты беларускага календара» і тэматычныя бібліяграфічныя спісы), шырока выкарыстоўваюцца ў розных установах адукацыі і культуры пры планаванні і падрыхтоўцы масавых мерапрыемстваў. У педагагічным працэсе спатрэбяцца раздзелы «Навінкі беларускага друку» і «У полі зроку рэцэнзента». Карысная крыніцай рэтраспектыўнага бібліяграфічнага пошуку з'яўляецца даведачны апарат выдання, які адлюстроўвае ўсе матэрыялы, што былі надрукаваны на старонках бюлетэня за год (гл. кожны дванаццаты нумар). Пры выяўленні беларусазнаўчай і краязнаўчай інфармацыі выкарыстоўваецца геаграфічны дапаможны паказальнік, для пошуку публікацый аб знакамітых асобах — персанальны. Навігатарам па літаратуры па розных галінах ведаў з'яўляецца прадметны паказальнік. Раздзел «Матэрыялы, апублікаваныя ў "Новых кнігах..." у ... годзе» ў алфавітным парадку адлюстроўвае матэрыялы да памятных дат і бібліяграфічныя спісы. У мэтах аказання дапамогі ўстановам адукацыі і культуры краіны ў планаванні работы пералік тэматычных дадаткаў на наступны год публікуецца у дванаццатым нумары дапаможніка.

Дзякуючы комплекснасці прадстаўленага ў бюлетэні матэрыялу, універсальнасці яго зместу «Новымі кнігамі...» карыстаюцца ўсе катэгорыі спажыўцоў незалежна ад узроўню інфармацыйнай культуры, узросту, адукацыі, прафесійных і асабістых інтарэсаў. Паказальнік паспяхова прымяняецца ў прафесійнай, адукацыйнай, самаадукацыйнай дзейнасці і для арганізацыі вольнага часу. Аператыўны выхад у свет, даступнасць для набыцця, наяўнасць цікавых рубрык, добрага даведачнага апарату, раскрыццё грамадска значных і актуальных тэм у дадатках надаюць выданню статус каштоўнай беларусазнаўчай інфармацыйнай крыніцы. Пазнаёміцца з дапаможнікам «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» можна ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і ў іншых бібліятэках краіны.

***Т.В.Наварыч,*** *бібліёграф I катэгорыі*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**15 ВЕРАСНЯ – ДЗЕНЬ БІБЛІЯТЭК!**

Гэтае свята з'явілася ў беларускім календары ў 2001 годзе і з той пары традыцыйна адзначаецца ў нашай краіне. Сёння ў Беларусі налічваецца каля 9300 бібліятэк рознага значэння (рэспубліканскія, абласныя, раённыя, сельскія), прызначэння (публічныя і спецыяльныя) і зместу фондаў (універсальныя і галіновыя). Адной з самых шматлікіх з'яўляецца сетка бібліятэк Міністэрства адукацыі, якому падпарадкоўваецца больш за 40% усіх бібліятэк рэспублікі. Гэта 2117 бібліятэк школ, ліцэяў і гімназій, 645 бібліятэк вучэбна-педагагічных комплексаў, 179 бібліятэк сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, 31 бібліятэка вышэйшых навучальных устаноў, а таксама бібліятэкі цэнтраў карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, сацыяльна-педагагічных цэнтраў, бібліятэкі ўстаноў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, бібліятэкі заканадаўчых, прадстаўнічых і выканаўчых органаў улады.